*Валянціна Пігас*

# *Не губляю сваe карані*

Кобрын
2021

УДК 821.161.3(476.7)
ББК 84(4Беи)-5
П32

**Пігас, В.**

П32 Не губляю свае карані : вершы / Валянціна Пігас. - Кобрын : Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2021. - 39 с.

Кніга кобрынскай паэткі Валянціны Пігас змяшчае вершы на беларускай мове. Аўтар дзеліцца з чытачамі любоўю да малой радзімы, назіраннямі за прыродай, разважаннямі аб жыцці. Асобным раздзелам ідуць вершы для дзяцей.

Выданне разлічана на шырокае кола чытачоў.

УДК 821.161.3(476.7)
ББК 84(4Беи)-5

© Пігас, В. В., 2021
© Афармленне. Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2021

## Не губляйце свае карані

Не губляйце свае карані!
Не забудзьце імёнаў ніколі
Дзедаў, прадзедаў тых, што вялі
Вас да лепшай, шчаслівае долі.

Не губляйце свае карані.
Раскажыце аб тым сваім дзецям,
Іх зярняты адкуль прараслі,
Голас продкаў у душы адгукнецца.

Не губляйце свае карані.
Назаўжды хай застануцца ў сэрцы
І бабулін абрус ільняны,
І матуля ў новай сукенцы.

Не губляйце свае карані,
Беражыце, шануйце ўспаміны,
Каб прадоўжыць жыццё на зямлі,
Бо інакш чалавецтва загіне.

Не губляйце свае карані...

## Мова матчына

Мова родная, мова матчына –
Ад бацькоў, дзядоў наша спадчына.
Мова любая, і пявучая,
І пяшчотная, неўміручая.
Мова шчырая і чуллівая,
Незабыўная і зычлівая.
Душу радуе слоўца кожнае,
Мілагучнае і прыгожае.

## Бацька

Зялёна-аксамітная кашуля,
Якую бацька апранаў у свята,
Стаіць перад вачамі, а матуля
Слязінку выцірае вінавата.

Святочны дзень, стол, стравамі багаты,
Размовы, весялосць, дзіцячы гоман.
Са здымка на сцяне глядзіць мой тата,
Малодшы за мяне ў гэты момант.

Усмешка ў вачах, нібыта намі
Любуецца, на ўнукаў паглядае -
І дрыжыкі па целу, у сэрцы камень.
Прайшлі гады, а боль не заціхае...

## Прабач мяне, вёска

Усё ярчэй у снах я бачу вёску,
Мой любы, наймілейшы сэрцу кут,
Ля хаты сарамлівую бярозку
І квеценню абліты сад, як цуд.

Чым болей я жыву на гэтым свеце,
Тым даражэй мне родная зямля.
На могілках журботна плача вецер,
Пад плітамі ляжыць мая радня.

Прабач сяброўку, вёска-чараўніца,
Хацелася б наведвацца часцей,
Каб чысцінёю неба наталіцца
І зберагчы крышталікі надзей.



## Сцяжынаю дзяцінства

Сцяжынаю дзяцінства залатога,
Што зведала з маленства ўшыр і ўдоўж,
Дзе бегала дзяўчынкай басаногай
Па лужах у прыемны летні дождж,

Іду, і ўспаміны душу грэюць,
І радуе ласкава шум бяроз.
Ды хаты нешта часта сірацеюць,
Стаяць, як небаракі, сумна скрозь.

Насустрач незнаёмыя больш людзі,
А дзе-нідзе бабулечка гукне:
«Ой, ледзь прызнала, мо багатай будзеш».
І калыхне фіранку на акне.

З сябрамі разам у другім кірунку
Шукала шчасце я ў чужых краях,
А зараз сэрца просіць паратунку.
Прабач за здраду, вёсачка мая.

## ***

Чырвань каліны,
Смак гаркаваты,
Клёкат буслiны,
Матчына хата,

Пах медуніцы,
Шэлест бярозкі –
Ты чараўніца,
Родная вёска.

## Мілы рамонкавы край

Мой мілы рамонкавы край,
Дзе жыта звініць каласамі,
За вёскай бярозавы гай
Пяе грыбнікоў галасамі.

Чаромхавы водар вясной,
Цвет бэзу ля матчынай хаты,
А чэрвеньскай летняй парой
Пах яблыкаў, сена і мяты.

Калі на душы неспакой
І сняцца дзяцінства часіны,
Бяру ўспаміны з сабой,
У родныя еду мясціны.

## Кусочак раю

Палессе – гэта кусочак раю,
Багацце кветак, палі без краю.
А на палях тых калоссе грае,
Шапоча бульба, лён падпявае.

Шчабечуць птушкі ў лясах Палесся –
Ляціць іх песня да паднябесся.
А ў рэчках сініх журчыць вадзіца,
Ад промняў сонца блішчыць, іскрыцца.

А говар гэты, акцэнт мясцовы,
Такі пявучы, такі мядовы.
Хто бачыў гэта, век не забудзе.
У згодзе з працай жывуць тут людзі.



## Берагіня-калыска

Дзяцінства майго берагіня-калыска,
Палеская вёска – малінавы край.
Аблокі плывуць па-над нівамі нізка,
За полем – шумлівы бярозавы гай.

Пунсовыя гронкі каліны ля ганку,
Вясною чаромхавы водар наўкол,
І смак сырадою прыветлівым ранкам,
Пад грушаю-дзічкаю рой жвавых пчол.

Пасля навальніцы красуня-вясёлка
Малюе ў паветры прывабны масток,
І ззяюць на сонцы іскрынкамі зёлкі,
Натолены вільгаццю кожны лісток.

Радзіма мая, наймілейшы куточак,
Чакаеш сяброўку з дарогі любой.
Сустрэча – мне шчасця, надзеі глыточак.
У думках заўсёды я разам з табой.

***

Учарашні дзень не вернецца ніколі,
Руплівы час бязлітасна імчыць.
Пах яблыкаў запоўніў наваколлі,
Птушыны спеў на ўсе лады гучыць.

Глядзі, душа, любуйся прыгажосцю,
Якую дорыць родны край штодзень.
На жаль, я тут бываю толькі госцяй,
А варта ўсё ж наведвацца часцей.

## Дарога ў вёску

Імчу па дарозе бясконцай.
Абапал – палі, вербалоз.
Лагодна ўсміхаецца сонца
З блакітна-бялёсых нябёс.

На жніве камбайны працуюць,
Машыны вязуць ураджай,
Буслы на іржышчы палююць.
І ўсё гэта – родны мой край.

Пярэсцяцца ў лесе хусцінкі,
Сасоннік звініць гаманкі,
Збіраюць чарніцы жанчынкі,
А ў небе пяюць жаўрукі.

На ўзгорку красуецца вёска,
Кранае пяшчотай здалёк.
Ля хаты бацькоўскай бярозка
Сяброўку вітае з дарог.

## ***

Бяжыць дарога ў вёску зімнім лесам,
І ззяе снег – аж іскры ў вачах.
Яловыя галінкі з паднябесся
Звісаюць у бялюткіх кажушках.

Іскрацца ў сонцы казачныя дрэўцы –
Карункавы бліскучы феерверк!
Займае дых, дрыготка б'ецца сэрца.
Спыніся на імгненне, стрэлак бег!



## Прыснілася

Мне дзіва дзіўнае прыснілася:
Да зорак я ляцела ўвысь,
Каля ярчэйшай прыпынілася.
Што гэта – мара ці капрыз?

Я нечакана азірнулася:
Навокал зорныя агні.
Карціна ўнізе разгарнулася:
Мой горад спіць у цішыні.

Спяць і завулачкі, і вуліцы,
Гараць начныя ліхтары,
І закаханыя мілуюцца
Пад цемрай ночы да зары.

Так часта сэрцайка забілася.
Хоць зоркі клікалі ізноў,
Ляцець далёка не згадзілася,
Хутчэй вярнулася дамоў.

## Вечар

Вечар цёплы і маўклівы.
Лёгкі ветрык лашчыць плечы.
Месяц ясны ганарліва
Заклапоціўся аб нечым.

Нібы важны наглядальнік,
Асвятляе ўсё навокал.
Аж да ранку гаспадарнік
Пазірае зоркім вокам.

## Люблю свой горад

Люблю свой горад, як тут сонца свеціць,
Кіпіць, звініць жыццё ў фарбах яркіх,
Калі ў дварах свавольнічаюць дзеці
І на блакітным небе – ані хмаркі.

Люблю свой горад, хоць і вечарэе,
Сінеча разліваецца ўпотай.
Адразу неяк свежасцю павее,
І стомленасць змяняецца пяшчотай.

Люблю свой горад ночанькаю цёмнай:
Пакой і цішыня, ды неба ў зорках,
А месячык разгульвае павольна,
Ды часам дзесьці ледзь чутна гаворка.

Люблю свой горад рознаю парою:
Зімою, летам, восенню, вясною.
Куточак слаўны роднай Беларусі,
Люблю цябе і гэтым ганаруся.

## Вераснёвы ранак

Раннім ранкам вераснёвым
Еду ў машыне.
Неба водбліскам ружовым
Вабіць з далячыні.

Нібы ружа, расцвітае
Казка-таямніца –
Гэта сонейка вітае
Тых, каму не спіцца.



## Брэсту

Ужо дзесяць стагоддзяў над Бугам
Раскрыляецца горад-герой.
За вайны баявыя заслугі
Беларусь ганарыцца табой.

Бо стаіш на ахове Айчыны,
На заходніх яе рубяжах.
А ўвечары вокам арліным
Ліхтары асвятляюць твой шлях.

Плошчы, вуліцы тонуць у кветках,
Ды струменяць усмешкі дзяцей,
Кожны дзень: і зімою, і ўлетку –
Сустракаеш прыветна гасцей.

Берасцейцы – народ карпатлівы –
Любяць горад свой і берагуць.
Хай жа кожны з вас будзе шчаслівым!
Людзі слаўныя у Брэсце жывуць.

## Зязюля

Зязюля кукуе ад долі гаротнай:
Дзяцей пагубляла, цяпер ёй самотна.
Паўлета праплача. А хто вінаваты?
Усе маці як маці, гадуюць дзіцятак.

Яна ж падкідала ў гнёзды чужыя,
А зараз смуткуе, ад роспачы вые.
Не знала, што сорамна стане калісьці.
І як, лёгкадумнай, знайсці сёння выйсце?

## Я шчаслівая

Я люблю, як дзень пачынаецца
З промняў сонца і цёплых слоў,
Калі чуецца «добрай раніцы»
Ад сям'і сваёй і сяброў.

Калі з вокнаў маіх даносіцца
Звонкі, радасны смех дзяцей.
Калі жыта ў палях калосіцца
Ды салоўка пяе часцей.

Калі яблыкі важкацелыя
Вока радуюць ў садах
І рамонкі смяюцца белыя
На духмяных ад траў лугах.

Калі вечар хадой маўкліваю
Разлівае сінечу скрозь,
Адчуваю сябе шчасліваю
І малюся святым за лёс!

## Сумлівы настрой

Восень зноў завітала ў госці,
І лістота трымціць залатая.
Ды кранае за сэрца штосьці,
Бо і шэрань, імжа бывае.

Навявае настрой сумлівы:
Халады ўжо не за гарамі.
Сонца зыркае нейк чулліва –
Мо таксама сумуе з намі?



## Рэчанька

Рачулка, рэчанька, мая сяброўчачка,
Прыходжу вечарам на бераг твой.
У вадзе люстэркавай мігаюць зорачкі –
Стаю, любуюся такой красой.

Прыйду шчаслівая – сустрэнеш радасна,
Абдымеш ножанькі жывой вадой.
Калі ў слязах прыйду – сумуем разам мы,
Дзялюся жаласна сваёй бядой.

Глядзіш даверліва і супакойваеш,
Душа адтайвае, праходзіць боль.
Майго жыцця ўсяго лісты прагортваеш.
Як сябра, раюся заўжды з табой.

## Незвычайны хор

Спявае за вёскаю жыта калоссем,
Разносіць мелодыю вецер-свавольнік.
Гучаць перапевы наўкол шматгалоссем,
Здзівіўся тым песням гарэзлівы конік.

Паслухаў хвілінку і зноўку стракоча,
А дуб-велікан каля самай дарогі
Лісточкамі штосьці таксама шапоча,
Чакае ад ветрыка ласкі-падмогі.

Валошкі, рамонкі на лузе зялёным,
Красуюцца ўдзячна ў пяшчотнай гамонцы,
І хор незвычайны, на дзіва чароўны,
Хвалюе напевам у роднай старонцы.

## Спякота

Тыдні тры замучвае спякота.
Да таго прагрэлася паветра,
Што напала на людзей нудота.
Хоць бы часам злёгку дунуў ветрык.

І палі нібы пасля пажару,
Дрэвы ў лесе ўсе напіцца хочуць.
Госпадзі, пашлі нам, грэшным, хмару,
Хай зямліцу дожджычак прамочыць.

Хай зазеляneюць траўка, дрэвы
Свежасцю натоляцца святою,
Зазвіняць музычныя напевы,
Загаіцца сэрцайка любое.

***

Я ў юнацтве любіла вясну,
І пралескі мне душу кранaлі.
Адчувала ва ўсім навізну,
Пра заморскія марыла далі.

Чараваў мяне ландыш лясны,
І дарыў яго водар натхненне.
Ноччу бачыла дзіўныя сны,
Але час праляцеў, як імгненне.

Сівізна дзе-нідзе ў валасах,
Падкрадаецца восень нясмела.
Хрызантэмы квітнеюць у садах,
Вока радуюць колерам белым.



## Залатая пара

Залатая пара, залатая!
Гэта восень нас шчыра вітае.
Лісце подыхам жоўта-барвовым
Палягло дываном каляровым,
Шапаціць і кранае пяшчотай,
Ды раптоўна знікае маркота.

## Адыход зімы

Стамілася зіма, засумавала,
Змагацца з цеплынёю сіл няма.
Старанна рэчкі ўсе ільдом скавала.
Прагрэла сонца – уцякай сама.

Пара, відаць, збірацца ў дарогу,
Ды хочацца пагасцяваць даўжэй.
Гукае завіруху на падмогу –
І зноў гудзе і свішча снегавей.

## Мядовае каханне

Салодкае, мядовае прызнанне:
Разліты водар квецені ў садах.
Пяшчотнае і сціплае крананне,
Крыху гаркавы прысмак на губах.

Узнёслае юнацкае каханне,
А потым плынь далей, да новых мэт
Ад той вясны, што несла мне ўранні
На падваконне бэзавы букет.

# Дзясяты вагон

Дзясяты вагон, пасажыраў нямнога.
Цягнік пакалыхвае, зоркі дрыжаць.
Са мною ў купэ толькі ты і дарога,
Гітара ў руках тваіх, песні гучаць.

Ад музыкі ціхай, пяшчотнай, нясмелай
Нутро халадзее, шчыміць у грудзях.
У вачах тваіх сініх агонь ашалелы,
І смак палыну на салёных губах.

Вось так і маўчым усю ноч да світання.
Хоць вочы ў вочы, а слоў не знайсці.
Калоціцца сэрца: пара развітання.
А ногі мярцвеюць, не хочуць ісці.

Мой горад агнямі мяне сустракае,
Ад шчасця сустрэчы звіняць галасы.
А там, у вагоне, гітара іграе,
Ад роспачы плачуць і стогнуць басы.

***

Не глядзі такімі сумнымі вачамі,
Лепш адразу адвярніся і ідзі.
І прабач, прашу, прабач, з душы скінь камень,
Толькі гэткімі вачамі не глядзі.

У вачах тваіх і боль, і боязь страты,
Крыўда, роспач, спадзяванне і нуда.
Вінавата прад табою, вінавата.
Толькі сэрцу не прыкажаш, вось бяда.



# Разам з табой

Мы разам з табой сустракаем золкі,
Глядзім на жыццё ў адным напрамку
І водарам лесу, духмяна-смолкім,
Частуем сябе часта летам зранку.

Мы разам з табой сустракаем зімы,
Завеі ды сцюжы, вясну гукаем,
А вечарам ціхім, пяшчотна-сінім
Лісты ўжо мінулых падзей гартаем.

Адны ўспаміны, адны трывогі,
Адны спадзяванні і хваляванні.
Вандроўнікі мы з аднае дарогі.
Дай, Божа, яшчэ вечароў, світанняў.

# Каханне

Я закаханых пазнаю здалёк:
Гараць іх вочы ў наш імклівы век.
І цеплынёю вее незнарок,
Калі праходзіць побач чалавек.

Іх знешні выгляд кажа мне яскрава,
Што шчасце найвялікшае – кахаць.
Настрой выдатны, ладзяцца ўсе справы,
І можна верыць, марыць і чакаць.

Прыходзіць да людзей тады натхненне,
Ствараюцца шэдэўры ў гэты час,
На свет глядзяць з вялікім захапленнем.
Дабрэйшымі каханне робіць нас.

# Цяжкі выпадак

Сябравалі з маленства хлопцы
І за партай сядзелі разам.
Пасля школы гайсалі ў вёсцы
Ды з рагатак стралялі часам.

Аб красуні адной і той жа
Ўздыхалі яны начамі,
Але выйсце знайшлі прыгожа,
Каб застацца навек сябрамі.

Пачакалі, калі дзяўчына
Закахаецца з іх у кагосьці.
Ажаніўся адзін хлапчына,
На вяселлі другі быў госцем.

І мацнела сяброўства з часам,
Сябравалі цяпер усе трое.
Ды жыццё аднаго з іх згасла:
Вінаваты хлопцы абое.

Да таго ўзяло за сэрца
Ў таго, што жывым застаўся.
Адчыніць як ад праўды дверцу?
Лепш маўчаць, ад людзей схавацца.

Так і жыў у адзіноце дзікай,
З жонкай сябра баяўся мовы.
І памёр у адчаі ціха.
А па вёсцы пайшлі размовы...



# Спыніся

Жыцця дарога не бывае лёгкай,
І пераждыць на свеце трэба многа.
То сонейка глядзіць пяшчотна ў вокны,
То з хмары цень праляжа ля парога.

То весялімся, танчым і спяваем,
То слёзы горка коцяцца з вачэй.
Таго, што побач, мы не заўважаем,
Далёкае здаецца нам ярчэй.

Усё бяжым, спяшаемся кудысьці,
Бывае, нават марна трацім час.
І як знайсці з той кругаверці выйсце?
Жыццё і так кароткае ў нас.

Спыніся, мілы сябра, на хвілінку,
Паглянь, якая ўсюды прыгажосць!
Душа твая ўжо просіць адпачынку,
Дый ты, бы ўсе, на свеце толькі госць.

# Мітусня

Мітусня. Кожны дзень мітусня,
Не хапае хвілінак у сутках.
А ўначы сніцца мне цішыня,
Луг зялёны ў рамонках бялюткіх.

Толькі ўранку прачнуся і зноў
Усё баюся кудысьці спазніцца.
Чарада хуткацечных гадоў
Вокамгненна ў турботах імчыцца.

## Аптэка

Стаіць чарга перад акенцам,
Паперка ў кожнага ў руках.
Камусьці забалела сэрца,
А хтосьці з колікай у баках.

Дзяўчына ў халаце белым
Не можа галавы падняць,
Бо трэба спрытна і ўмела
Рэцэпты ўсе перачытаць.

Мо дзе памылка ў напісанні
Ці з дозай яўны перабор?
А ў натоўпе – хваляванне,
Чутны ўжо лаянка, дакор.

І лопнула цярпення чаша:
«Ну колькі можна? Трацім час».
У яе ж руках – здароўе ваша,
Жыццём адказвае за вас!

## Аскубены птах

Праляцеў у жыцці матыльком легкакрылым,
Прызямліўся туды, дзе гарэла ярчэй.
І кахання не бачыў бязмежнае сілы,
І не зведаў ад шчасця бяссонных начэй.

Немаўлятка малое не люляў ніколі,
На руках не трымаў, не шчымела ў грудзях.
Так хацелася шыку, багацця і волі,
Ды застаўся адзін, як аскубены птах.



## Дарагая сяброўка

Як жывеш, дарагая сяброўка?
Быў нялёгкім твой шлях у жыцці,
Бо спачатку – шчаслівая жонка,
Потым – слёзы ліла ў забыцці.

Рана зведала ўдовіну долю
І іспыт на трываласць здала.
Не схілілася нізка да долу,
Засталася такой, як была.

Не згубіла ні людскасць, ні годнасць,
Дапаможаш заўсёды ў бядзе.
Хай сардэйка чужую халоднасць
Не спазнае ніколі нідзе.

## Бывае ўсё ў першы раз

Бывае ўсё калісьці ў першы раз,
І застаюцца ўспаміны з намі.
Ідзеш ты побач з мамай у першы клас,
А з кветкамі – на першы свой экзамен.

Букет у руцэ пралесачак лясных,
І першы пацалунак на спатканні,
А потым сняцца казачныя сны
Пра першае шчаслівае каханне.

Пабачыш многа ўсякага ў жыцці,
Ды і спакусаў зведаеш нямала.
Але не згасне недзе ў забыцці,
Калі што ўпершыню з табой бывала.

## Надзея на новы год

Завяршаецца дзве тысячы дваццаты –
Незвычайны і складаны, цяжкі год,
І ўвесь свет каронавірусам абʼяты.
Не спраўляецца з хваробаю народ!

Пандэмія перакрэсліла ўсе планы –
Анікуды не паехаць, не пайсці.
Шмат людзей ужо знаёмых пахаваны.
І якое выйсце з гэтага знайсці?

Толькі ўсё-ткі шмат чаго мы зразумелі,
Больш маліцца сталі, родным больш званіць.
Мне здаецца: нашы душы пасвятлелі,
Прагнуць справы толькі добрыя рабіць.

І аказваецца, шчасце – быць без маскі
Ды з сябрамі чай з цукеркамі папіць,
Паздаровацца з суседкай без апаскі,
Кожны дзень свайго жыцця цаніць, любіць.

Спадзяюся, што наступіць дваццаць першы
І засвецяцца праменьчыкі надзей.
Будзе год, напэўна, радасны і лепшы,
Вельмі хочацца ўжо сонечных падзей.

## Навагодняя ноч

Новы год падкрадаецца зноў.
Падарункаў чакаем і дзіва,
Адчыняем ад сэрца засоў,
Марым, марым аб нечым чулліва.

Бо ў кожнага мара свая,
Патаемная і трапяткая.
З хваляваннем любая сямʼя
Навагоднюю ноч сустракае.



## Завяршаецца год

Завяршаецца зноўку яшчэ адзін год,
Каляндар ліст апошні губляе.
І гадзіннік назад не паверне свой ход,
Толькі сэрца ўспаміны люляе.

Бачу ў дзецях сваіх я іскрынкі святла,
Што старалася даць ім з дзяцінства.
Той адрэзак, відаць, нездарма пражыла,
Бо ўжо ўнукі прыносяць гасцінцы.

Каляндар адкрывае свой чысты лісток,
Абнаўляецца ўсё на планеце.
І жыццё пачынае свой новы віток,
За зімою – вясновая квецень.

## З Новым годам, Кобрын!

Мой слаўны Кобрын, горад, сэрцу мілы!
Люблю цябе за вуліц чысціню,
За прыгажосць, якая дорыць сілы
Мне ў вершах славіць родную зямлю.

Віншую горад шчыра з Новым годам.
Жадаю міру, шчасця ў кожны дом.
Няхай зіма святочным карагодам
Запаліць душы казачным агнём,

А горад прыгажэе год ад году,
Квітнее беларуская зямля,
І дабрабыту нашаму народу,
Багатых ураджаяў на палях.

Няхай заўжды ў вокны сонца свеціць
І неба будзе сінім над зямлёй,
Не знаюць слёз і гора нашы дзеці.
Мой Кобрын, ганаруся я табой!

## Шчодры вечар

Добры вечар! Шчодры вечар!
Песні, жарты, віншаванні.
Гаспадыні каля печы
Каўбасу пякуць старанна.

Моладзь, дзеці з хаты ў хату
Ўсіх віншуюць з Новым годам,
Ураджай каб быў багатым,
А ў сем'ях – мір ды згода.

«Пачастуйце, калі ласка», –
Песняй госцейкі вітаюць.
Твар ў кожнага пад маскай,
Зернем хату абсыпаюць.

Спадары ім падпяваюць,
Падаюць прысмакаў кошык,
Душы насцеж адчыняюць
У вечар шчодры і прыгожы.

## З Раством Хрыстовым!

Віншую вас з цудоўным святам,
Раством Хрыстовым – светлым днём.
Жадаю шчасцейка багата
Ды сонца, міру ў кожны дом.

Каб не пагаслі аніколі
Святлінкі веры, дабрыні,
Надзей крышталікаў уволю,
Любові ў душы, цеплыні.



## Калядны

Дарослыя і дзеці вераць у казку
Ў зімнія калядныя дзянькі.
«Калядніκі, заходзьце, калі ласка», –
Запрошваюць вандроўнікаў жанкі.

У душах цеплыня і асалода,
Бо так прыемна віншаваць сяброў.
А над зямлёй сняжынак карагоды
Пяюць пра спаконвечную любоў.

## Мытня

Я на мытні стаю ў раздуменні,
Марна трачу, здаецца мне, час.
Гэта мытня, у маім разуменні,
Робіць злыднямі нейкімі нас.

Беларусь, за мяжой – Украіна.
Ці раней я падумаць магла?
Гэта ж наша была ўся краіна,
У мяне там сяброўка жыла.

У дзяцінстве гулялі з ёй разам
На канікулах цэлымі днямі,
Весяліліся, марылі часам,
Мір і лад быў заўжды паміж намі.

А цяпер у чарзе нейкай дзіўнай
Я на мытні стаю тры гадзіны,
І ад гэтага сумна і крыўдна.
Як шкада мне былыя часіны...

# Бабуліна бяда

У бабулі Алены
Што ні дзень, то туга:
Забалела калена,
Амярцвела нага.

Крок за крокам пацíху
Ледзь дайшла да стала.
Прытамілася крыху,
І сляза пацякла.

Дзетак маючы трое,
Засталася сама.
Прыязджалі вясною,
Ды ўжо зноўку зіма.

Снегу гурбы пад хатай,
Трэба ў печы паліць,
Сцежку чысціць лапатай,
А нагой не ступіць.

Во дзе гора дык гора.
Што бабулі рабіць?
Ліза дзесьці на моры –
Мо да Веры званіць?

Вочы выцерла хусткай,
Нумар Верын знайшла.
Дазванілася хутка,
Трубку ўнучка ўзяла.

Вера ў камандзіроўцы,
Будзе дзён цераз пяць.
Трэба ўсё-ткі ў вяскоўцаў
Дапамогі шукаць,



Бо сыночак адзіны
Ў замежнай Літве
Разам з жонкай Галінай
Два гады ўжо жыве.

Штосьці грукнула ў сенцах,
І нуда адышла.
Адчыніліся дзверцы –
Тут суседка зайшла.

Пажурыліся разам,
Як тут быць, як тут жыць.
А сусед гэтым часам
Дроў прынёс пратапіць

Ды прывёў фельчарыцу
(Самы жвавы быў дзед).
Трэба, трэба лячыцца,
Бо хваробаў букет.

Два ўколы, пілюлі
Фельчар бабцы дала.
Акрыяла бабуля,
Кліча ўсіх да стала.

# Здрада

Бацька, прыйшоўшы дахаты,
Погляд адвёў вінавата.
«Дзе затрымаўся так доўга?» –
Дзеці пытаюць з парога.
Вогнішчам жаліць балючым
Позірк вачэй іх калючых.
Слёзы ледзь-ледзь, ды стрымалі,
Моўчкі дачушкі стаялі.
Камнем застыў разам тата,
Горкай маною распяты.

## Выбух у метро

У метро сталіцы ў людным месцы
Ў панядзелак выбух грымнуў.
І згаслі маладыя сэрцы
Ў тых, хто там наш свет пакінуў.

Смуткуе люд у Беларусі
Ад вераломнага злачынства.
Хто і чаму сябе прымусіў
Да гэтых жудасных бясчынстваў?

Каб памятаць аб тых ахвярах
Жахліва-дзікага здарэння,
Краіна з пачарнелым тварам
У Бога просіць прабачэння.

Пашлі нам, Божа, пакаянне,
Дары святло Ты ў душы людзям,
Надзею, веру і каханне,
І хай бяды ў нас больш не будзе.

## Мае дзетачкі

Мае слаўныя, любыя дзетачкі,
Я гляджу ў вашы вочкі цікаўныя.
Вы вясновыя яркія кветачкі,
Душы – светлыя, словы – кранальныя.

Хай жыццё зазвініць песняю звонкаю
І струменяць усмешкі шчаслівыя.
Ганарыцеся роднай старонкаю,
І выдатных вам поспехаў, мілыя.



## «Зомбі»

Чарсцвеюць сэрцы ў людзей,
А больш за ўсё здзіўляюць дзеці,
Якія ў баку падзей
Увесь час праводзяць у інтэрнэце.

Ды потым выйдзе хлапчаня,
Не бачыць прад сабой нікога,
Бо ў галаве яго гульня –
Стралялкі, танкі – не дарога.

І крочыць, нібы «зомбі», ён,
Хоць святлафор гарыць чырвоным.
Углядваецца ў тэлефон,
Які заўжды ў руках ягоных.

Настаўнік не аўтарытэт,
Бацькі патрэбны – «таўстасумы».
Дык гэтак прападзе наш свет,
Бо знікне чалавек разумны.

## Ты, напэўна, паэт

Калі ў кроплях дажджу ці ў парывах халоднага ветру
Чуеш музыку ты і акорды гучаць у душы,
А апалае лісце ў вальсе кружыць у паветры,
Ты, напэўна, паэт, у радках свае думкі пішы.

## Бяссонніца

Месяц здзекліва смяецца,
Заглядаючы ў акенца,
Бо бяссонніца-сяброўка
Абманула вельмі лоўка.
Заглянула на хвіліну,
А гасцюе тры гадзіны.
То спачатку разважала,
Што знянацку завітала,
Папрасіла прабачэння,
Што зайшла без запрашэння.
І – пытанне за пытаннем,
Успаміны, разважанні…
Думкі льюцца на паперу…
Ранак грукае ўжо ў дзверы…

## Летняй ноччу

Цішыня гучыць цікава –
Адчыняю насцеж вокны.
Месяц танчыць злева ўправа,
Ліхтары дрыжаць дрымотна.

Камары звіняць галосна,
Дзесь далёка гром грахоча,
Вее свежасцю дзівоснай.
Мне не спіцца летняй ноччу.

Уся сям'я адпачывае,
Бачыць сон ужо не першы.
Вочы ціха прыкрываю,
А на волю рвуцца вершы.



## З Музай

Маё знаёмства з Музай – важкі камень.
Заглядвае свавольніца ўначы,
Мы разам слоўцы трапныя шукаем,
Ад думак анікуды не ўцячы.

Ды часта за спіною чую кпіны:
«Каму патрэбна лірыка ў наш час?
Завісла ў паэтычнай павуціне.
Хіба табе падняцца на Парнас?»

Але калі салодка б'юць у скроні
Радкі, кранаюць з самай глыбіні,
Лаўлю імгненні шчасця я ў далоні,
А зоркі мне смяюцца з вышыні.

## Жыву надзеяй

Няўжо нікому не патрэбны словы,
Што рвуцца з самай глыбіні душы,
Лірычныя радкі на роднай мове?
А сэрца падштурхоўвае: «Пішы.

Пішы на мове матчынай, пявучай
Аб родным краі і яго красе.
Мо **слоўца** закране каго балюча
**Ці** нават асалоду прынясе?»

Не спіцца ноччу – зноў бяру паперу,
Шукаю словы трапныя у радок.
Жыву надзеяй, спадзяюся, веру,
А восень шле праз фортачку лісток.

## Паэтка

Не спіцца паэтцы ўночы,
Да зорак падняцца хоча,
Ды й муза прыйшла ў госці,
Шапоча на вуха штосьці.

То кроплі дажджу ў акенца
Кранаюць чулліва сэрца,
То чуецца хор жабіны,
Як песня журбы-журбіны.

Хоць ціха заплюшчыць вочы,
Не спіцца паэтцы ўночы.
Радкі свае піша, піша,
А ночка яе калыша.

## Памяці Марыі Радзевіч

Жыццё цікаўнай слаўнае жанчыны
Было, як промень сонца, казка, песня,
Бо, палюбіўшы Грушава мясціны,
Апісвала ўсю прыгажосць Палесся.

Пісьменніцай была і мецэнаткай,
Кружкоўцам кнігі дарма выдавала.
Яе сяляне палюбілі надта,
Бо часта пані ім дапамагала.

Сама сябе лічыла хлебаробам,
Лаўровага вянка не захацела,
Адказнасць адчувала прад народам,
А таленту ўсё ж зорка зіхацела.



## Кніга

Адкрываю старонку, другую
І – плыву за героямі ўслед.
Разам з імі жыву і вандрую,
Свае думкі ўплятаю ў сюжэт.

Ад прачытаных кніг хваляванні
Назаўжды застаюцца ў душы –
Як Таццяна пісала пасланне,
Як смерць сына Тарас перажыў.

Кніга – лепшы дарадца і лекар,
Верны сябра, падручнік жыцця,
Дапаможнік знайсці чалавеку
Асалоду ў часы забыцця.

Электронны фармат не заменіць
Кнігі той, што гартаю ў руках,
Дзе старонкі шапочуць, струменяць,
Кожны ліст бы ўзлятаючы птах.

# Дзецям

## А ўрокі ўсё ідуць...

Сонца свеціць у акенца –
Вочы самі рвуцца ўбок,
А настаўніца злуецца,
Бо яшчэ ідзе ўрок.

А на дошцы тэарэмы
І ўмовы для задач.
Меркавання новай тэмы
Мне не хочацца, хоць плач.

Трэба выканаць заданне,
На пытанні адказаць,
Прачытаць апавяданне,
А затым пераказаць.

Там гамонка, шум, раздолле,
Птахі весела пяюць.
Сэрца рвецца так на волю,
Толькі ўрокі ўсё ідуць...



## Фігурыстка

Кожны дзень на трэніроўку
Ходзіць Юля ранкам рана,
Дзе праходзіць падрыхтоўку
Па фігурным па катанні.

Выкрутасы са скачкамі
То налева, то направа
Вымалёўвае канькамі –
Танчыць спрытна, лоўка, жвава.

А затым імчыць дадому,
Каб у школу не спазніцца.
Добра вучыцца, вядома,
Наша Юля-працаўніца.

## Тры дзяўчынкі

Тры прыгожыя дзяўчынкі.
Хоць узрост у кожнай свой,
Тры вясёлыя іскрынкі
Падымаюць дом гарой.

Ужо старэйшай адзінаццаць,
А малодшай толькі год –
Усім раўнёю можна звацца,
Разам водзяць карагод.

А бабуля ля дзяўчынак,
Нібы міліцыянер,
Бачыць кожны іх учынак
Ды й пацягне за каўнер.

***

Прыбегла Юлечка са школы –
Настрой бадзёры і вясёлы.
З парога крыкнула матулі
Галосна, каб усе пачулі:
«Глядзіце, ужо партфель ірвецца:
Дзясяткам не хапае месца!»

## Соня і галубка

Галубка дзюбай у шыбу б'ецца,
Магчыма, з весткаю для нас.
А Соня радасна смяецца:
Такое бачыць у першы раз.

Гарыць хітрынка ў вачанятках.
Гарэза з зэдлікам бяжыць,
Глядзіць на птаху вінавата,
Акно ж не можа адчыніць.

## Унучцы Соф'і

Галоўкаю круціш вяртлява,
То ўлева глядзіш, то направа.
Блакітнага колеру вочкі
Разглядваюць усе закуточкі.

Лапочаш дзівосныя гукі,
Ласкава працягваеш рукі,
Прыгожая цуда-дзяўчынка,
Надзеі і шчасця іскрынка.



## Каця ў вёсцы

Каця ў вёсцы ўпершыню.
Дужа тут цікава!
Весела крычыць каню:
«Гэта што за з'ява?»

Трохгадовае дзіця –
Упартая дзяўчынка –
Грозна вучыць жарабца:
«Не тапчы раслінкі.

Не памыўшы, траўку ў рот
Не бяры ніколі.
Забаліць табе жывот,
Доктар дасць уколы!»

## Змест


Не губляйце свае карані ........................................ 3
Мова матчына ........................................................ 3
Бацька ..................................................................... 4
Прабач мяне, вёска ............................................... 4
Сцяжынаю дзяцінства ........................................... 5
*** Чырвань каліны... ............................................. 5
Мілы рамонкавы край ............................................ 6
Кусочак раю ........................................................... 6
Берагіня-калыска ................................................... 7
*** Учарашні дзень не вернецца ніколі... .......... 7
Дарога ў вёску ....................................................... 8
*** Бяжыць дарога ў вёску зімнім лесам... ....... 8
Прыснілася ............................................................. 9
Вечар ...................................................................... 9
Люблю свой горад ................................................ 10
Вераснёвы ранак .................................................. 10
Брэсту ................................................................... 11
Зязюля .................................................................. 11
Я шчаслівая .......................................................... 12
Сумлівы настрой .................................................. 12
Рэчанька ............................................................... 13
Незвычайны хор .................................................. 13
Спякота ................................................................. 14
*** Я ў юнацтве любіла вясну... ......................... 14
Залатая пара ........................................................ 15
Адыход зімы ......................................................... 15
Мядовае каханне .................................................. 15
Дзясяты вагон ....................................................... 16
*** Не глядзі такімі сумнымі вачамі... ................ 16
Разам з табой ....................................................... 17
Каханне ................................................................. 17
Цяжкі выпадак ...................................................... 18
Спыніся ................................................................. 19
Мітусня ................................................................. 19
Аптэка ................................................................... 20
Аскублены птах .................................................... 20
Дарагая сяброўка .................................................. 21
Бывае ўсё ў першы раз ......................................... 21
Надзея на новы год .............................................. 22
Навагодняя ноч ..................................................... 22
Завяршаецца год .................................................. 23
З Новым годам, Кобрын! ...................................... 23
Шчодры вечар ...................................................... 24
З Раством Хрыстовым! ......................................... 24
Каляды .................................................................. 25
Мытня .................................................................... 25
Бабуліна бяда ....................................................... 26
Здрада ................................................................... 27
Выбух у метро ...................................................... 28
Мае дзетачкі ......................................................... 28
«Зомбі» ................................................................. 29
Ты, напэўна, паэт ................................................. 29
Бяссонніца ........................................................... 30
Летняй ноччу ........................................................ 30
З Музай ................................................................. 31
Жыву надзеяй ....................................................... 31
Паэтка ................................................................... 32
Памяці Марыі Радзевіч ......................................... 32
Кніга ...................................................................... 33

**Дзецям ................................................................ 34**
А ўрокі ўсё ідуць... ................................................ 34
Фігурыстка ............................................................ 35
Тры дзяўчынкі ....................................................... 35
*** Прыбегла Юлечка са школы... ...................... 36
Соня і галубка ....................................................... 36
Унучцы Соф'і ......................................................... 36
Каця ў вёсцы ......................................................... 37

Літаратурна-мастацкае выданне

**Пігас** Валянціна Васільеўна

# Не губляю свае карані

Вершы

Рэдактар Н. П. Ефціфеева
Камп'ютарная вёрстка Н. П. Ефціфеева
Карэктар Н. П. Ефціфеева

Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізваная бібліятэчная сістэма».
Вул. Маршала Жукава, 12,
225306, г. Кобрын, Брэсцкая вобл.
kobrinlib@gmail.com; krcls.by;
тэл. 8-01642-3-85-81.

12 +